# ЗМЕСТ

*Кацярына Гліністая*
**Стары Мінск прачынаецца**
*(пераклад Ірыны Зінкевіч)* . . . . . . . . . . . . . . . . . 7

*Алёна Кучынская*
**Скрадзены час**
*(пераклад Ірыны Зінкевіч)* . . . . . . . . . . . . . . . . . 13

*Настасся Гарбачова*
**Справа № 31. Талісман**
*(пераклад Ірыны Зінкевіч)* . . . . . . . . . . . . . . . . . 29

*Аляксандра Гарачка*
**Лаўцы зорак**
*(пераклад Ірыны Зінкевіч)* . . . . . . . . . . . . . . . . . 69

*Ія Палікарпава-Гілевіч*
**Радня**
*(пераклад Ірыны Зінкевіч)* . . . . . . . . . . . . . . . . . 86

*Кацярына Стрынгель*
**Кандытар мары**
*(пераклад Ірыны Зінкевіч)* . . . . . . . . . . . . . . . . . 109

*Ганна Асокіна*
**Пацалунак русалкі**
*(пераклад Паліны Грыб)* . . . . . . . . . . . . . . . . . 123

*Віка Малікава*
**Карона Паднора**
*(пераклад Паліны Грыб)* . . . . . . . . . . . . . . . . . 149

*Ануша Захарэвіч*
**Антыкварыят з душой**
*(пераклад Яны Владыкі)* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 186

*Кацярына Тэн*
**Апошні вагон**
*(пераклад Яны Владыкі)* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 198

*Таццяна Блохіна*
**Захавальнік**
*(пераклад Наталлі Давыдоўскай)* . . . . . . . . . . . 224

*Мар'яна Дуброўская*
**Кароль званоў**
*(пераклад Наталлі Давыдоўскай)* . . . . . . . . . . . 236

*Алеся Лісоўская*
**І свет больш не быў пустым**
*(пераклад Наталлі Давыдоўскай)* . . . . . . . . . . . 246

*Ніка Айкан*
**Ноч у тэатры**
*(пераклад Наталлі Давыдоўскай)* . . . . . . . . . . . 273

*Яўгенія Ляхавец*
**Паўночнае таксі**
*(пераклад Наталлі Давыдоўскай)* . . . . . . . . . . . 286

Пасляслоўе . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 300



Кацярына Глiнiстая

# СТАРЫ МІНСК ПРАЧЫНАЕЦЦА

Максім заўважыў небяспеку выпадкова. Можна сказаць, пашанцавала. Ён ішоў ад тэатра да праспекта, думаючы пра сваё, як раптам бакавы зрок выхапіў незвычайную для начнога парку тэкстуру. Луска? У той жа момант нешта кінулася ў яго бок, але Максім ужо быў гатовы. Істота замёрла: ці то ўлавіла пах, ці нейкім іншым чынам зразумела, з кім мае справу. Максім, не рухаючыся, разглядаў яе: доўгія цёмныя валасы, ломкія бледныя рукі. Русалка, ды яшчэ так далёка ад узбярэжнай! Ён звыкла склаў пальцы, рыхтуючыся кінуць заклён.

Русалка выскалілася і кінулася прэч — да ракі. Яна рухалася на здзіўленне хутка, спрытна перабіраючы рукамі па зямлі, і калі б Максім не дапамагаў

сабе магіяй, то даўно б адстаў. Ён бег уздоўж дэкаратыўных каменных ваз на агароджы парку, намагаючыся не страціць нечысць з вачэй. Дасягнуўшы Свіслачы, русалка нырцанула ў ваду. Максім, не вагаючыся ні секунды, скокнуў следам.

Вада была каламутнай, досыць прахалоднай, але не ледзяной. Максім агледзеўся па баках і, не заўважыўшы слядоў русалкі, завучаным жэстам адкрыў пераход у Падсвецце. Пару імгненняў мяжа паміж светамі супраціўлялася заклёну, але ўрэшце Максім адчуў, што ціск саслаб: пераход удаўся.

Апошнія пару дзясяткаў гадоў ён бываў тут рэдка: нечысць агулам пацішэла, а ўжо тая, следам за якой даводзілася ісці ў Падсвецце, тым болей. Максім здзівіўся: за час яго адсутнасці тут усё моцна змянілася. Ажывілася. Карані духаў дрэў цяпер спускаліся з невядомай вышыні ў бяздонныя глыбіні, павольна пагойдваючыся, як багавінне. Скрозь зараснікі, пульсуючы, цякла сіла. Ашаламляльны кантраст з той пустыняй, якая сустрэла яго ў Падсвецці мінулым разам. Ураўнаважваючы сябе заклёнамі, Максім аглядаўся. Дробныя падсветныя духі сноўдалі між каранямі, быццам рыбкі ў мігатлівым святле. Чарадзей павёў рукой — рух пакінуў за сабой лёгкі след з жамчужных бурбалак. Максім усміхнуўся: вось жа, ён ужо і ўспомніць не мог, калі апошнім разам Падсвецце было такім. Цікава, што ажывіла магію?..

У гэты момант русалка атакавала.

Яна раптам з'явілася з суплёту хвалістых каранёў, імклівая і смяротная. Схапіла Максіма за за-



Алёна Кучынская

# СКРАДЗЕНЫ ЧАС

У крамцы выстаўляліся рэчы зусім рознага кшталту: ад вытрадлівых пажоўклых папяровых лебедзяў і бурштынавых павукоў з крывымі лапамі да сусветна вядомых карцін, якія наведнікі прымалі за копіі. Тут ва ўсіх пад носам пакрываліся пылам адна з балерын Эдгара Дэга і «Шпацыр» Шагала. Апошнюю карціну гаспадыня Вера берагла асабліва і штораз адгаворвала пакупнікоў, калі тыя праяўлялі да палатна занадта пільную цікавасць. Гэтая карціна была адным з самых каштоўных успамінаў пра дзяцінства і тым нямногім, што звязвала яе з бясследна зніклым бацькам.

Захоўваліся ў краме і зусім дзіўныя рэчы: папяровая мапа ў цяжкай раме, з выявай незнаёмага

раёна Мінска (часам вуліцы на ёй мяняліся месцамі, а рака кожны раз цякла там, дзе ёй уздумаецца); старадаўні насценны гадзіннік, стрэлкі якога спыняліся, а пасля ішлі наперад ды раптам назад; камода з глыбокай расколінай на веку, шуфлядкі якой непрадказальна высоўваліся самі, а ўнутры іх штораз аказвалася нешта новае — скамечаная ўлётка, засушаны пучок зёлак ці пачак цыгарэт. Але, здавалася, ніхто і не заўважаў гэтых дзівосаў, акрамя самой Веры.

Крамка практычна не прыносіла грошай і насамрэч была прыкрыццём. Самае значнае адбывалася ў глыбіні залы, дзе ля сцяны стаяў стол, загрувашчаны кнігамі, паперамі і абгорткамі ад шакаладу. Сярод усяго тут ляжала і шыльда з надпісам: «*Знайду што заўгодна. Дорага*».

Вера, сумуючы, сядзела за сталом і беспаспяхова спрабавала спапяліць позіркам пустую тэчку з надпісам «Справа №». Размерана пастуквала секундная стрэлка на гадзінніку, сёння ён ішоў задам наперад і цяпер паказваў без чвэрці сем. Веру хіліла ў сон, калі званочак на дзвярах ціха бомкнуў.

У краму ўвайшла высокая станістая асоба ў чорным строі. Твар жанчыны прыхоўвалі шыракаполы капялюш, цёмныя акуляры і вугальна-чорная медыцынская маска. Вера бліснула вачыма, і стрэлка на гадзінніку замёрла, быццам той збіраўся прыслухоўвацца да таго, што мае адбыцца.

— Добры дзень! Што шукаеце?

У адказ жанчына зайшлася кашлем, і толькі калі прыступ скончыўся, суха выціснула:

— Час.

Вера на імгненне разгубілася.

— Прабачце?

Жанчына з адчаем скінула на падлогу маску, наступнымі туды ж упалі акуляры, агаляючы маршчыністы твар.

— Час! Ён скраў мой ЧАС! — выгукнула жанчына і зноўку закашлялася.

Вера з цікаўнасцю схіліла галаву і сцішыла дыханне. Новае заданне, ды яшчэ якое! Не проста фамільны пярсцёнак ці кашалёк — самы сапраўдны скрадзены час! Чаго толькі ёй не даводзілася шукаць за апошнія два гады, нават зніклую ў Мінску музыку. Але гэта! Гэта быў зусім іншы ўзровень. Вера паднялася з адзінага ў краме крэсла і жэстам прапанавала жанчыне сесці.

— Мы пазнаёміліся на вакзале, я вярталася з камандзіроўкі, — жанчына прысела і пачала расказваць, няспешна здымаючы пальчаткі. — Назваўся Міхалам. Ахайна апрануты, з манерамі і неверагодна прыгожы. Дапамог з валізкамі, выклікаў таксоўку і пакінуў нумар.

Старая сціснула кулакі, глыбока ўздыхнула.

— Я ніколі не тэлефаную першай, а тут не ведаю, што на мяне найшло, ды варта было мне застацца адной, як я ўжо набірала гэтаму мярзотніку.



Аляксандра Гарачка

# ЛАЎЦЫ ЗОРАК



— Лаві! Лаві хутчэй!

Перад тварам успыхнула, і я зажмурылася. Міма пранеслася нешта зыркае, іскрыстае і гарачае. Такое гарачае! Я міжволі кранулася броваў — ці на месцы. А вогненны шарык праляцеў зусім побач, з ціхім меладычным звонам стукнуўся аб пакацісты бок даху, пракаціўся па чарапіцы, адскочыў ад жалабка вадасцёка і — плюх! — знік у нетрах варонкі трубы.

Мы абое — я і мой невядомы начны прыяцель — замёрлі на краі даху, прыслухоўваючыся.

«Дзынь-дрынь-дзілі-дам!» — звінеў вогненны шарык, пакуль каціўся па жалезнай горцы, а затым выскачыў недзе ля трэцяга пад'езда і — пшык — плюхнуўся проста ў лужыну. Згас.

— Ну вось, — раззлавана выгукнуў мой новы незнаёмы. — Упусціла! Такую зорку!

Ён глядзеў на мяне расчаравана, быццам я ў жыцці не здзяйсняла больш сур'ёзнай правіны, а я на яго — з цікаўнасцю. Гняздо светлых валасоў, рабацінкі, такія яркія, што бачныя нават ноччу, паласаты квяцісты шалік перакінуты праз плячо... Адкуль жа ўзяўся гэты сярдзіты хлопец? Ды і я адкуль узялася? Тут, тут узялася — на даху. Я, нібыта, вышыні баялася, ды і наогул усяго секунду таму проста...

— Новенькая? — здаецца, пра нешта здагадаўся ён, паправіў лямку заплечніка, і я міжволі адзначыла, што ні разу дагэтуль не бачыла, каб такі просты жэст выглядаў так дзелавіта і прафесійна. Працягваючы нясціпла разглядаць яго, я аўтаматычна кіўнула, але тут жа перапытала:

— Прабач, што ты сказаў?

— Адразу відаць, што новенькая, — фыркнуў ён і, развярнуўшыся на пятках, пайшоў па чарапіцы.

Так лёгка і спакойна, быццам ішоў па выкладзеным пліткай тратуары, а не па слізкім жалезным грабеньчыку даху! Мне падумалася, што гэтай хадой — рукі ў кішэні, чаравікі шоргаюць — ён мог бы паспрачацца майстэрствам з самым знакамітым эквілібрыстам у свеце.

— Панабіраюць па абвестках, — не перастаючы, бухцеў ён. — Усё на свеце потым правароняць!

Я тэпала за ім следам на паўсагнутых нагах, расставіўшы рукі для балансу і падстрахоўкі, і ўсё ж

не адчувала ні ценю былога страху вышыні. Ужо нават пачала сумнявацца, што наогул калісьці яе баялася.

— Прабач, — перапрасіла я, дагнаўшы незнаёмца ля самага вільчака даху. — Я не хацела. Я задумалася.

Сказала і сапраўды задумалася. Я не памятала, пра што думала ў той момант. Я нават — ну бывае такое! — не зусім разумела, калі менавіта «той» момант наступіў.

— Такая зорка была! Добрая зорка. Зімовая яшчэ, апошняя. Цяпер такую да наступнага года не дачакаешся, — хлопец ізноў сарваўся ў сваю скруху, але тут жа ўзяў сябе ў рукі. — Добра, што ўжо цяпер прасіць прабачэння.

— Ноч доўгая, — адчуваючы сябе выдатніцай, якая накасячыла, сказала я. — Можа...

— Вось адразу відаць — новенькая, вучыць цябе яшчэ, — перабіў ён. Зірнуў па баках, і ў ягоным позірку прамільгнуў калі не спалох, то насцярожанасць; затым зіркнуў на мяне — ці не заўважыла я гэтага страху — і ўздыхнуў. — Добра ўжо, новенькая, не новенькая, а лішні лавец не перашкодзіць. Завуць цябе хоць як?

— Яна, — назвалася я.

— Жэня, — у тон кіўнуў хлопец.

Ён зверыўся з гадзіннікамі. Сапраўды з гадзіннікамі, у самым што ні на ёсць множным ліку! Цыферблаты — механічныя і электронныя, круглыя



